ГРОДЗЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ
БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А.Я. МАКАЁНКА




БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС ДА 110-ГОДДЗЯ
З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІХАСЯ ВАСІЛЬКА

ГРОДНА – 2015

*Творчасць і лёс Міхася Васілька [Тэкст]: бібліяграфічны спіс да 110-годдзя з дня нараджэння Міхася Васілька* (1905 – 1960) / *Гродзенская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.Я. Макаёнка; уклад. Д.У. Крачко. – Гродна, 2015. – 12 с.*

*У бібліяграфічным спісе літаратуры прадстаўлены матэрыялы аб гродзенскім паэце Міхасе Васільку. Акрамя таго, даюцца звесткі пра некаторыя празаічныя творы і вершы, прысвечаныя паэту, найбольш значныя бібліяграфічныя крыніцы.*

*Матэрыялы размешчаны па асноўных тэматычных раздзелах, а ўнутры – у алфавіце аўтараў і загалоўкаў. Бібліяграфічнае апісанне падпарадкоўваецца ДГСТу 7.1-2003 “Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення”. Бібліяграфічны спіс літаратуры будзе карысны выкладчыкам, настаўнікам, студэнтам, школьнікам, бібліятэкарам.*

Прадмова



Псеўданім, які абраў сялянскі паэт Міхась Восіпавіч Касцевіч з вёскі Бароўня, што над берагам Котры, – Міхась Васілёк – цалкам адпавядае эстэтычнай традыцыі, запачаткаванай прадстаўнікамі масавай паэзіі нашаніўскай пары: у ім гучыць тая ж прага красы, і тая ж крэўная повязь з сялянскай нівай, з сялянскай працай, з жыццём беларускай вёскі.

Міхась Васілёк з кагорты тых сялянскіх паэтаў, што прайшоў складаны жыццёвы шлях пры ўсіх рэжымах: у дзяцінстве – бежанства за часам першай сусветнай вайны, здзекі ў паліцэйскіх пастарунках у перыяд панскай Польшчы найперш за тое, што пісаў вершы ды па-беларуску, арышт і ўціск за саветамі пасля вайны.

Міхась Васілёк нарадзіўся 14 лістапада 1905 г. паблізу Скідаля ў вёсцы Бароўня Гарадзенскага раёна ў сям'і лесніка. Сярэднюю адукацыю атрымаў у 1921 г. у Казлове (Мічурынску), дзе разам з бацькамі быў у бежанстве. У бежанстве Міхась страціў маці, якая хварэла на сухоты. У 1922 г. вярнуўся на радзіму.

У 1926 – 28 гг. служыў у войску ў Гродне. У гэты час працаваў у заходнебеларускім часопісе “Маланка”. Старажылы Скідаля ўспаміналі тэатральныя сцэнкі і пастаноўкі ў мястэчку, у якіх браў актыўны ўдзел паэт – Васілёк чытаў сатырычныя вершы, поўныя гумару, якія падмацоўваліся ілюстрацыямі, што выконваў сябра– аднавяскоўвец Рыгор Каскевіч.

У канцы 30– х гадоў уступіў у Беларускую сялянска – рабочую грамаду. Арганізоўваў гурткі Таварыства беларускай школы. За ўдзел у рэвалюцыйным руху польскія ўлады неаднаразова арыштоўвалі і саджалі ў турму. У 1939 г. быў мабілізаваны ў польскае войска, удзельнічаў у вайне Польшчы з фашысцкай Германіяй. У час баёў трапіў у нямецкі палон. У жніўні 1941 уцёк з палону, дабраўся да родных мясцін і ўключыўся

ў падпольную барацьбу. Кіраваў Скідальскім падпольным антыфашысцкім камітэтам, пад псеўданімам *Язэп Гром* выступаў у партызанскім друку.

Пасля вызвалення працаваў у скідальскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1944 – 1946 г.), пазней працаваў літкансультантам у абласной газеце «Гродзенская праўда». З 1945 г. член Саюза пісьменнікаў СССР .

Друкаваўся ў газетах "Народная справа", "Наш голас", "Народны звон", "Наша воля", "Беларускі дзень", "Наша праўда", "Беларуская газета", часопісах "Маланка", "Калосьсе", "Нёман", "Снапок".

Памер у Гродне 3 верасня 1960 г., пахаваны на праваслаўных гродзенскіх могілках. Вуліца, поруч з якой жыў паэт, носіць яго імя, на доме, што пабудаваны на месцы апошняга прытулку паэта, у 1986 г. устаноўлена мемарыяльная дошка.

У друку выступаў з 1926 г. у віленскіх выданнях. Першы зборнік лірыкі «Шум баравы» (Вільня, 1929) быў канфіскаваны паліцыяй. Рукапіс другога зборніка быў канфіскаваны дэфензівай і знішчаны (1934 г.). У 1937 г. ў Вільні выйшаў зборнік «З сялянскіх ніў».

У савецкі час выдадзены кнігі паэзіі «Выбраныя вершы» (1950), «Выбраныя творы» (1955), «Зоры над Нёманам» (1963), «Вершы» (1973).

Выбар паэтычнага псеўданіма абумоўлены еднасцю з беларускай прыродай, сімвалам яе сціплай красы:

*Не паэт я – о не,*
*Нарадзіла мяне,*
*Маю песню – пакута, нядоля.*
*Я ўсяго васілёк,*
*Лёс, відаць, назнарок*
*Мяне кінуў на сумнае поле.*

"Адметнае ж, што вылучала Міхася Васілька ў літаратуры, – здольнасць адкрываць прыгожае ў звычайным, тварыць паэтычны малюнак на матэрыяле добра вядомага, будзённага жыцця," – гэтак вызначыў сутнасную прыкмету паэзіі гарадзенскага творцы літаратуразнаўца А.М. Пяткевіч.

## ТВОРЫ МІХАСЯ ВАСІЛЬКА


1. Васілёк, М. Выбраныя творы. – Мінск, 1955.
2. Васілёк, М. Выбраныя вершы. – Мінск, 1950.
3. Васілёк, М. Вершы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. – 173 с. – (Б-ка беларускай паэзіі).
4. Васілёк, М. З сялянскіх ніў. – Вільня, 1937.
5. Васілёк, М. Зоры над Неманам: выбранае. – Мінск, 1963.
6. Васілёк, М. Шум баравы. – Вільня, 1929.

7. Васілёк, М. Добры дзень, мой горад родны...: верш / М. Васілёк // Гароднявершах ў песнях: і памяць, і пашана, і любоў... – Гродна, 2008. – С. 16.
8. Васілёк, М. Не заўседы...: верш / М. Васілёк // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
9. Васілёк, М. Піянерскі лагер: верш / М. Васілёк // Гродзенская праўда. – 2004. – 4 снежня. – С. 5.
10. Васілёк, М. Родны край: верш / М. Васілёк // Бацька наш Нёман. – Мінск, 2001. – С. 384 – 385.
11. Васілёк, М. Уперад, браце; Не пытай; Тых, хто шчасця дзён пазбыты; Роднай матулі: [вершы] / М. Васілёк // Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т. – Мінск, 1993. – Т. 2. – С. 201 – 203.
12. Васілёк, М. Шкада роднага краю: верш / М. Васілёк // Гродзенская праўда. – 2004. – 4 снежня. – С. 5.
13. Васілёк, М. Я; Купалу; Гарэлка: вершы / М. Васілёк // Гродзенская праўда. – 2000. – 11 лістапада. – С. 4.
14. Васілёк, М. Як я пана перанёс; Эх, каб грошы: вершы / М. Васілёк // Гродзенская праўда. – 1995. – 14 лістапада.


## ЖЫЦЦЯПІС ПАЭТА


15. Васілёк, М. Аўтабіяграфія / М. Васілёк // Пра час і пра сябе: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / склад. і падрыхт. тэксту Я. Казекі. – Мінск: Беларусь, 1966. – С. 69 – 72.
16. Василёк Михась // Биографический справочник. – Минск: Белорусская советская энциклопедия имени Петруся Бровки, 1982. – Т. 5. – С. 103. – 737 с.

17.Васілёк Міхась // Беларускія пісьменнікі (1917– 1990): даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі; нав. рэд. А. Л. Верабей. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – С. 96.
18.Міхась Васілёк // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / пад рэд. А. І. Мальдзіса. – Мінск: БелЭн, 1992. – Т. 1. – С. 529.
19.Васілёк Міхась // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 25.
20.Васілёк Міхась // Культура Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 222.
21.Васілёк Міхась // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 229.
22. Васілёк Міхась // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1984. – Т. 1. – С. 582.
23.З жыццяпісу паэта [Міхася Васілька] // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
24.Паэты і пісьменнікі Гродна. Міхась Васілёк // Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў, Я.М. Жабрун, І.П. Крэнь і інш. – Мінск, 1999. – С. 641– 642.
25.Самойла, Г. Хутар над Котрай: пра дзіцячыя і юнацкія гады Міхася Васілька / Г. Самойла // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 27 кастрычніка. – С. 12.
26.Токць, С. Баброўня – вёска паэтаў : да пытання аб генеалогіі сялянскага роду Касцевічаў / Сяргей Токць ; фота // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 1. – С. 15 – 21.

## ТВОРЧЫ ШЛЯХ ВАСІЛЬКА

27. Адамчык, В. Сны ад ясным прадвесні / В. Адамчык // Літаратура і мастацтва. – 1963. – 13 снежня. – С. 6.
28.Арочка, М. З пройдзеных шляхоў: [пра Міхася Васілька] / М. Арочка // Полымя. – 1964. – № 6. – С. 76 – 71.
29.Барысаў, І. "Дзівак з Баброўні": аб паэце М. Васільку / І. Барысаў // Гродзенская праўда. – 2009. – 15 жніўня. – С. 3.

30.Баўтрэль, І. "Мой вяночак васільковы...": [пра Міхася Васілька і яго паэзію] / І. Баўтрэль // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 16 сакавіка (№ 11). – С. 15.
31.Бічэль-Загнетава, Д. З сялянскіх ніў / Д. Бічэль-Загнетава // Літаратура і мастацтва. – 1985. – 15 лістапада. – С. 6.
32.Вішнеўскі, І. “Вёснаў сплецены вянок…”: [паэт Міхась Васілёк] / І. Вішнеўскі // Літаратура і мастацтва. – 1974. – 5 красавіка. – С. 7.
33.Глебка, П. Мастацкая літаратура Заходняй Беларусі: [паэзія Міхася Васілька] / П. Глебка // Глебка, П. Паэзія барацьбы і перамогі / П. Глебка. – Мінск, 1973. – С. 226 – 228.
34.Дзелянкоўскі, М. "П'е асалоду душа": да 100-годдзя з дня нараджэння Міхася Васілька / М. Дзелянкоўскі // Гродзенская праўда. – 2005. – 27 кастрычніка. – С. 6.
35.Жэбрак, П. Соймавыя прамовы натхнялі на вершы: [паэзія Міхася Васілька] / П. Жэбрак // Биржа информации. – 2000. – 30 ноября. – С. 4.
36.Зяневіч, Г. Шчыры паклон: [Міхась Васілёк] / Г. Зяневіч // Полымя. – 2008. – № 5. – С. 165– 167.
37.Калеснік, Ул. Жыццё і прызванне / Ул. Калеснік // Васілёк М. Зоры над Нёманам. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1963. – С. 3–14.
38.Калеснік, Ул. Міхась Васілёк / Ул. Калеснік // Калеснік У. Лёсам пазнанае / Ул. Калеснік. – Мінск, 1982. – С. 31.
39.Калеснік, Ул. Міхась Васілёк / Ул. Калеснік // Полымя. – 1962. – № 9. – С. 175–180.
40.Карлюкевіч, А. У пошуках гарадзенскіх знакамітасцяў: пра беларускіх пісьменнікаў Васіля Быкава, Дануту Бічэль– Загнетаву, Міхася Васілька, Юрку Голуба, Марыю Шаўчонак, Аляксея Пяткевіча, Вольгу Іпатаву, Аляксея Карпюка // Карлюкевіч, А. Радзімазнаўства. Мясціны. Асобы : краязнаўчыя нарысы / Алесь Карлюкевіч. – Мінск, 2010. – С. 47– 49.
41.Карпюк, А. Прызнанне: [пра Міхася Васілька] / А. Карпюк // Наднёманскія былі. – Мінск: Беларусь, 1968. – С. 284 – 286.
42.Майхровіч, С. Замест уступу: [паэзія Міхася Васілька] / С. Майхровіч // Майхровіч С. Янка Брыль. Жыццё і творчасць. – Мінск, 1961. – С. 16.
43.Мікуліч, М. "З сялянскіх ніў...": да 100-годдзя Міхася Васілька / М. Мікуліч // Полымя. – 2006. – № 2. – С. 185– 195.

44.Мікуліч, М. Паэзія Міхася Васілька: пошукі лірычнага героя / М. Мікуліч // Шлях да ўзаемнасці. – Гродна, 2004. – С. 293 – 303.
45.Мікуліч, М. У шуме баравым: творчасць Міхася Васілька 20-х гадоў / М. Мікуліч // Гродзенская праўда. – 2003. – 13 ноября. – С. 7.
46.Мікуліч, М. У шуме баравым: творчасць Міхася Васілька 20-х гадоў / М. Мікуліч // Галасы. – Гродна, 2004. – С. 276 – 288.
47.Мікуліч, М.У. "Я сын мазоля, сын раллі…" (колькі штрыхоў да творчага партрэта Міхася Васілька) / М.У. Мікуліч // Мікуліч, М.У. Пошук вядзе ў глыбіню: літаратурна– крытычныя артыкулы, старонкі інтэрв'ю, публікацыі / М.У. Мікуліч. – Гродна: ГрДУ, 1998. – С. 23 – 31.
48.Мурина, С. Михась Василёк [Михаил Костевич; 1905, д. Бобровня Гродн. р-н – 1960, Гродно] / Светлана Мурина; фото // Гродзенская праўда. – 2012. – 5 снежня. – С. 33.
49.Мурина, С. Михась Василёк: [о материалах, посвящённых жизни и творчеству поэта в музее "Гродненский правды"] / С. Мурина // Гродзенская праўда. – 2012. – 5 снежня. – С. 33.
50.Пасяўцова, М. "Я – ўсяго Васілёк" / М. Пасяўцова // Наднёманскія былі: зборнік артыкулаў і нарысаў. – Мінск: Беларусь, 1979. – С. 271 – 283.
51.Пяткевіч, А. Васілёк Міхась / А. Пяткевіч // Людзі культуры Гродзеншчыны: даведнік / А. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ. – С. 48 – 49.
52. Пяткевіч, А. Паэзія з сялянскіх ніў / А. Пяткевіч // Пяткевіч, А. Старонкі спадчыны: культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы / А. Пяткевіч. – Мінск: Беларускі кнігазбор. – С. 169 – 174.
53.Пяткевіч, А. Паэзія з сялянскіх ніў: творчасць і лёс Міхася Васілька / А. Пяткевіч // Родная слова. – 2005. – № 11. – С. 9 – 12.
54.Самойла, Г. Шчыры паклон: да 100-годдзя з дня нараджэння Міхася Васілька / Г. Самойла // Гродзенская праўда. – 2005. – 6 жніўня. – С. 12.
55.Саяпин, В. Поэт Михась Василёк на Советской площади. Середина 50– х гг. / В. Саяпин // Саяпин, В. История гродненских площадей / В. Саяпин. – Гродно, 2011. – С. 15.
56.Танк, М. Міхась Васілёк / М. Танк // Танк, М. Збор твораў: у 6 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – Т. 6. – С. 355 – 358.

57.Хавела, А. Васильковое поле: к 110-летию со дня рождения Михася Василька / А. Хавела // Перспектива. – 2015. – 18 ноября. – С. 26.
58.Шагойка, Л. Васілёк у жыце Беларушчыны...: [пра Міхася Васілька] / Лідзія Шагойка; фота // Голас Радзімы. – 2014. – 28 жніўня. – С. 1, 4.
59.Шырма, Р. Песні барацьбы і народнага шчасця: [творчасць Міхася Васілька] / Р. Шырма // Шырма, Р. Песня – душа народа / Р. Шырма. – Мінск, 1993. – С. 274 – 278.
60.Юркавец, Г. "Я пішу, як магу...": аб жыцці і творчасці Міхася Васілька / Г. Юркавец // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.

## УСПАМІНЫ ПРА ВАСІЛЬКА

61.Дзелянкоўскі, М. Наш Василёк: да 95-годдзя з дня нараджэння Міхася Васілька / М. Дзелянкоўскі // Гродзенская праўда. – 2000. – 11 лістапада.
62.Зайцаў, Дз. Ведаў Васілька: успаміны Дз. Зайцава, былога начальніка штаба партызанскага атрада "Баявы" пра Міхася Васілька / Дз. Зайцаў // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
63.Кот, В. Жыў на Пясочнай Васілек: аб паэце М. Васільку / В. Кот // Гродзенская праўда. – 2009. – 15 красавіка. – С. 12.
64.Курыла, М.М. Мы родам з Баброўні: [гутарка з аднавяскоўцам Міхася Васілька Міхаілам Мацвеевічам Курылам] // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
65.Лабовіч, А. І вершы пісаў, і суполкі ствараў: пра беларускага паэта Міхася Васілька / А. Лабовіч // Лабовіч, А. Партрэты знаных і нязнаных/ А. Лабовіч. – Гродна, 2006. – С. 93 – 96.
66.Марціноўскі, П. У маладыя гады: [успаміны пра Міхася Васілька]. – 2000. – 11 лістапада. – С. 4.

## ТВОРЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ПАЭТУ

67."100 гадоў з дня нараджэння Міхася Васілька": [аб конкурсе на лепшы мастацкі твор пра паэта] // Гродзенская праўда. – 2005. – 5 красавіка. – С. 3.
68.Бойкова, Р. Василёк: верш / Р. Бойкова // Милицейский вестник. – 2009. – 26 ноября. – С. 23.

69.Буднік, І. Міхасевы песні: верш, прысвечаны Міхасю Васільку / І. Буднік // Гродзенская праўда. – 2005. – 1 лістапада. – С. 3.
70.Вараб'ёва, Л. Васільку: [верш] / Л. Вараб'ёва // Гродзенская праўда. – 2005. – 1 лістапада. – С. 3.
71.Варанец, В. Дзень як дзень: апавяданне, прысвечанае Міхасю Васільку / В. Варанец // Гродзенская праўда. – 2005. – 1 лістапада. – С. 3.
72.Васько, У. Роздум пра час: [верш памяці Міхася Васілька] / У. Васько // Гродзенская праўда. – 2005. – 7 чэрвеня. – С. 3.
73.Голуб, Ю. Міхась Васілёк: [верш, прысвечаны Міхасю Васільку] / Юрка Голуб // Гродзенская праўда. – 1995. – 15 лістапада. – С. 3.
74.Голуб, Ю. Сінеча Васілька: [верш, прысвечаны Міхасю Васільку] / Юрка Голуб // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
75.Губернатараў, М. Васілек: верш / М. Губернатараў // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
76.Губернатараў, М. Васілек; Лілея: вершы / М. Губернатараў // Перспектива. – 2006. – 18 студзеня. – С. 21.
77.Іверс, А. Памяці паэтаў: [Міхась Васілёк] / А. Іверс // Іверс А. Жыву ў бацькоўскім краі / А. Іверс. – Мінск, 1982. С. 153 – 154.
78.Іпатава, В. Міхасю Васільку: верш / В. Іпатава // Іпатава В. Ліпеньскія навальніцы: вершы / В. Іпатава. – Мінск, 1973. – С. 54.
79.Кудлачёв, В. Оружием и словом: [стихотворение о белорусском поэте М. Васильке (1905, д. Бобровня Гродн. р-на – 1960, Гродно)] / В. Кудлачёв // Кудлачёв, В. Нарисую город Гродно : стихи. – Гродно, 2003. – С. 26.
80.Пераможцы [конкурса "100 год з дня нараджэння Міхася Васілька"] // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
81.Куц, В. Стихи в картузе: верш, прысвечаны Міхасю Васільку / В. Куц // Гродзенская праўда. – 2005. – 1 лістапада. – С. 3.
82.Маляўка, М. Зорка ў небе, васілёк у полі: [верш] / Мікола Маляўка; фота // Полымя. – 2013. – № 11. – С. 3 – 7.
83.Мартынчук, В. Міхась Васілек. Медаль. Гліна: [ізаматэрыял] / В. Мартынчук // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
84.Масян, І. Санет: светлай памяці Міхася Васілька : [верш] / Іосіф Масян // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 ліпеня. – С. 3.
85.[Міхась Васілёк]: партрэт // Роднае слова. – 2005. – № 11.
86.Петрашэвіч, Я. Міхасю Васільку : [верш пра беларускага паэта] / Яўген Петрашэвіч // Гродзенская праўда. – 2013. – 22 чэрвеня. – С. 6.

87.Петрашэвіч, Я. Памяцi паэта [Міхася Васілька] / Я. Петрашэвіч // Гродзенская праўда. – 2005. – 15 лістапада. – С. 3.
88.Прудкогляд, Л. Летом 1933-го: рассказ, посвящённый 100-летию Михася Василька / Л. Прудкогляд // Гродзенская праўда. – 2005. – 2 жніўня. – С. 3.
89.Салей, А. "Прыйдзе шчасця пара залатая": верш да 100-годдзя М. Васілька / А. Салей // Гродзенская праўда. – 2005. – 9 ліпеня. – С. 12.
90.Салей, А. "Прыйдзе шчасця пара залатая": верш / А. Салей // Настаўніцкая газета. – 2005. – 15 лістапада. – С. 4.
91.Самойла, Г. Балада Галіны: верш, прысвечаны Міхасю Васільку і яго жонцы Галіне Будзько / Г. Самойла // Гродзенская праўда. – 2005. – 1 лістапада. – С. 3.
92.Смолка, В. Звонка ў полі шасціць васілёк...: [верш] / Вікторыя Смолка ; фота // Літаратура і мастацтва. – 2015. – 18 верасня. – С. 4.
93.Спрынчан, А. Згадка Багдановіча; Васілёк у жыце… // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 19.
94.Стадуб, А. Трыпціх: [верш, прысвечаны 100-годдзю з дня нарадзіўся Міхася Васілька] / А. Старадуб // Гродзенская праўда. – 2005. – 13 жніўня. – С. 12.

## ЭЛЕКТРОННЫЯ РЭСУРСЫ

95.Міхась Васілёк. Біяграфічныя звесткі. Творчасць // Вікіпедыя: свабодная энцыклапедыя. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/. *– 27.11.2015.*
96.110 гадоў з дня нараджэння Міхася Васілька [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: http://harodniaspring.org /be/news/7778. – *27.11.2015.*
97.Галіна Самойла. Шчыры паклон: пра Міхася Васілька [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.pisateli.by/2015/g–samoila.htm. *– 27.11.2015.*

## БІБЛІЯГРАФІЯ

98. 90 год з дня нараджэння Міхася Васілька // Новыя кнігі. – 1995. – № 6. – С. 24– 25.

“ТВОРЧАСЦЬ І ЛЁС МІХАСЯ ВАСІЛЬКА”

Бібліяграфічны спіс літаратуры
да 110-годдзя Міхася Васілька

На беларускай і рускай мовах

Складальнік: Крачко Д.У.
Рэдактар: Ілюшына І.М.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.

Тыраж: 6 экз.

